Источник: "Веды" - 2012-11-05

# Волату беларускай паэзіі прысвячаецца

**У Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі праходзіць мноства мерапрыемстваў па папулярызацыі беларускай літаратуры і творчасці беларускіх пісьменнікаў. 3 лістапада спаўняецца 130 гадоў з дня нараджэння вялікага майстра слова – Якуба Коласа – паэта, драматурга, палымянага публіцыста. Навуковая бібліятэка, якая носіць імя класіка беларускай літаратуры, актыўна далучылася да важнай падзеі і адзначае разам з грамадскасцю слаўны юбілей нашага земляка.**

На працягу ўсяго года ў фае бібліятэкі ладзіцца выстаўка, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа. Экспазіцыю складаюць раздзелы, прысвечаныя вывучэнню творчай спадчыны песняра, а таксама яго творы, зборнікі, пераклады на розныя мовы, біяграфічныя звесткі.

Яшчэ 21 лютага, у Міжнародны дзень роднай мовы ў ЦНБ НАН Беларусі была арганізавана акцыя «Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх – беларуская родная мова».

У рамках акцыі прайшлі літаратурныя чытанні твораў на беларускай мове, у тым ліку вершаў Якуба Коласа. Актыўны ўдзел у акцыі прынялі навукоўцы Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Да гэтай падзеі была арганізавана кніжная выстаўка «Мова продкаў маіх і нашчадкаў маіх – беларуская родная мова». Экспазіцыя прысвечана гісторыі нацыянальнай мовы, якая непарыўна звязана з духоўнай культурай беларускага народа. Асобны раздзел выстаўкі быў прысвечаны славутым імёнам Беларусі, сярод якіх вылучаюцца Якуб Колас і Янка Купала, чыя спадчына з'яўляецца каштоўнай часткай нацыянальнай культуры.



Па жаданні дэкламантаў вершаў вёўся іх відэазапіс. Відэаролікі размясцілі на сайце ЦНБ НАН Беларусі. Сярод удзельнікаў акцыі было шмат школьнікаў. Каб прыцягнуць іх увагу, спецыяльна для дзяцей быў падрыхтаваны конкурс-віктарына «У сузор'і геніяў».

Да канца года кожны жадаючы можа прыняць удзел у літаратурных чытаннях твораў беларускіх песняроў.

Зараз у дні восеньскіх канікул для школьнікаў арганізаваны літаратурныя чытанні да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа. Першыя ўдзельнікі чытанняў прыйшлі да нас 31 кастрычніка.

У Год кнігі ў бібліятэцы была арганізавана экспазіцыя «Кнігі-юбіляры-2012», па матэрыялах якой падрыхтавана віртуальная выстаўка. На ёй прадстаўлены вядомыя творы беларускай мастацкай літаратуры – юбіляры 2012 года. Асаблівую цікавасць выклікаюць кнігі, якія выйшлі ў свет больш за паўстагоддзя таму, – юбіляры, якім споўнілася ў бягучым годзе 50-100 гадоў. Сярод выданняў вялікую колькасць складаюць творы Якуба Коласа.

Мерапрыемствы, што ладзяцца ў ЦНБ НАН Беларусі ў гонар Якуба Коласа, спрыяюць папулярызацыі творчасці класіка нашай літаратуры, накіраваны на прыцягненне ўвагі чытачоў, у тым ліку маладога пакалення, да творчай спадчыны беларускіх пісьменнікаў, любові да чытання, кнігі, роднай мовы.

**Вольга СМЫК,**
**заг. аддзелам сацыякультурнай і інфармацыйнай дзейнасці ЦНБ НАН Беларусі**

Вольга Смык. Волату беларускай паэзіі прысвячаецца